2. Старинный обычай проведения "Пиліпаўскіх вячорак" воссоздали в Пинском районе [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://vk.com/wall-144961270_25190. – Дата доступа: 11.09.2024

# СУВЯЗЬ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Жогла Г. У.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – канд. гіст. навук, дац. Сіткевіч С. А.

Беларуская мова з’яўляецца адным з найважлівейшых элементаў нацыянальнай ідэнтычнасці беларускага народа. Яе роля ў фарміраванні беларускай дзяржаўнасці не можа быць пераацэнена, бо мова не толькі адлюстроўвае культурную і гістарычную спадчыну, але і з’яўляецца асновай для развіцця нацыянальнай свядомасці і самасвядомасці. У сучасных умовах, калі Беларусь імкнецца захаваць сваю незалежнасць і ўмацаваць дзяржаўныя інстытуты, пытанне захавання і развіцця беларускай мовы набывае асаблівую актуальнасць, разам з пытаннем карэляцыі мова – дзяржаўнасць.

Беларуская мова – старажытная праіндаеўрапейская мова, якая налічвае больш за дзесяць стагоддзяў свайго пісьменства. Але ж сучасны этап развіцця нашай мовы бярэ свой пачатак толькі ў XIX стагоддзі, з моманту, калі былі зроблены першыя спробы стварыць літаратурную мову з народных гаворак, распрацаваць першую беларускую граматыку.

Дзеля комплекснага разумення карэляцыі мова – дзяржаўнасць неабходна разгледзець у рэтраспектыве развіццё двух названых суб’ектаў.

Хараналогія развіцця беларускай мовы, складзеная на падставе работ Ф.М. Янкоўскага: *старажытнаславянскі перыяд (X – XIII ст.)*, *старабеларускі перыяд (XIII – XIX ст.)*, што ўключае ў сябе субперыяды ВКЛ і Рэчы Паспалітай (РП), Расійскай Імперыі, *сучасны перыяд (XIX ст. – наш час)*, які падзяляецца на наступныя субперыяды: пачатак XX стагоддзя, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, пад нямецкай акупацыяй, пасляваенныя часы, найноўшы час [1].

Храналогія развіцця нацыянальнай дзяржаўнасці уключае наступныя этапы: *дадзяржаўны (V – IX ст.), старажытнарускі (IX – XIII ст.), ВКЛ (XIII – XVI ст.), Польска-Літоўскі (XVI – XVIII ст.), Расійская Імперыя (XIX – пач. XX ст.), Савецкі перыяд (1917 – 1991 гг.), Рэспубліка Беларусь (1991 г. – наш час)* [2].

Легка заўважыць, што кожны новы этап развіцця дзяржаўнасці больш-менш супадае з кожным новым этапам развіцця нашай мовы. Пры троху больш дэталёвым разглядзе гістарычнай кан’юнктуры, няцяжка заўважыць тую самую



Рэпазіторый ГрГМУ

карэляцыю. Калі пачынаўся новы этап развіцця дзяржаўнасці, змяняўся і статус беларускай мовы. Першым уздымам нашай мовы з’яўляўся перыяд ВКЛ, дзе мовай справаводства, свецкага і рэлігійнага жыцця была старабеларуская мова. Менавіта тады былі створаныя такія помнікі нашай мовы, як “Біблія” Скарыны (1517 г.), статуты ВКЛ, метрыка ВКЛ (XV – XVIII ст.), слоўнік старабеларускай мовы Памвы Бірынды (1596 г.). Падчас перыяду РП пачалася паланізацыя. З’явіліся досыць цікавыя філалагічныя фенамены – беларуская лацінка (прадукт паланізацыі) і беларуская арабіца (у сувязі з асіміляцыяй татар на нашай зямлі). У далейшы час пад кантролем Расійскай Іперыі ў адказ на нацыянальна-вызваленчы рух на беларускай зямлі прадпрымаліся спробы забарону беларускай мовы. Так, у 1839 г. – забаронена ўжыванне беларускай мовы ў касцёлах; 1859 г. – забаронены друк беларускай лацінкай; 1867 г. – забаронены друк беларускай мовай цалкам. Тым не менш, у 1859 г. было дазволена выдаваць беларускія этнаграфічныя зборнікі.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі была створана БССР, дзе беларуская была адной з 4-х дзяржаўных моў, а справаводства і адукацыя былі пераважна на ёй. Менавіта тады нашая мова перажыла свой другі ўздым. У той час і была створана “Беларуская граматыка для школ” Б.Тарашкевіча. У перадваенныя часы паступова стаў скарачацца спіс кніг, што выдаваліся беларускай мовай. У часы вайны нямецка-фашысцкія захопнікі прынеслі так званую “вайтрутэнізацыю”. Дадзеная з'ява ўключыла ў сябе ўжыванне беларускай мовы акупацыйнымі ўладамі ў камунікацыі з грамадствам. Тлумачыцца палітыка такога кшталту ідэалогіяй нацысцкага рэжыму. Варта падкрэсліць, што нацысцкая прапаганда шырока ўжывала беларускую мову для насаджэння антысавецкіх настрояў. Амаль адразу пасля заканчэнні вайны быў узноўлены курс на ўзмацненне ролі рускай мовы і культуры. Асобныя і несістэмныя выпадкі процідзеяння гэтаму з боку кіраўніцтва БССР (напрыклад, К. Мазураў у канцы 1950-х гадоў) на агульны кірунак развіцця падзей не паўплывалі. Прывяло гэта да таго, што ў наш час на рускай мове ў Беларусі размаўляе 71,37 адсоткаў людзей [3]. Сёння беларуская мова мае статус дзяржаўнай разам з рускай.

Такім чынам, мова – важны палітычны інструмент, які можа быць ужыты для ўмацавання ці аслаблення дзяржаўнасці.

Гісторыя развіцця беларускай мовы і дзяржаўнасці цесна пераплеценыя – разам з умацаваннем дзяржаўнасці, набывала моц і мова.

Беларуская мова з’ўляецца *гарантам* умацавання дзяржаўных інстытутаў Беларусі, захавання нацыянальнай культуры і ідэнтычнасці, якія з’ўляюцца падмуркам нацыянальнай дзяржаўнасці.

Літаратура:

1. Янкоўскі, Ф.М. Гістарычная граматыка беларускай мовы / Ф.М. Янкоўскі. – Мінск: Вышэйшая школа, 1989. – 301 с.

2. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік / І.А. Марзалюк [і інш.] / пад агульнай рэд. І.А. Марзалюка. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.

Рэпазіторый ГрДМУ

3. Национальный статистический комитет Республики Беларусь [Электронный ресурс.] – Режим доступа: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/publications/izdania/public_compilation/index_41896/. – Дата доступа : 27.09.2024.

# ВЯРХОЎНЫЯ БАГІ СЛАВЯНСКАГА ЯЗЫЧНІЦКАГА ПАНТЭОНА

**Зуеўская В. У.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – канд. філал. навук, дац. Хлусевіч І. М.

Тэма славянскага язычніцтва выклікае нязменнную цікавасць як у спецыялістаў, так і аматараў, паколькі пралівае святло на карані славянскай культуры. Язычніцтва, на змену якому прыйшло хрысціянства, характарызавалася антрапаморфным політэізмам, які з’яўляецца самай старажытнай формай уяўлення чалавека пра навакольны свет. У даўнія часы людзі не маглі растлумачыць многія з’явы прыроды, ад якой цалкам залежалі, таму адухаўлялі яе, уяўлялі ў выглядзе чалавекападобных багоў ці багінь, якія кіравалі гэтымі прыроднымі з’явамі і ўплывалі на лёс чалавека.

На жаль, звестак пра славянскі пантэон багоў захавалася не так многа. Так адбылося таму, што ў перыяд хрысціянізацыі ўсе помнікі паганства знішчаліся. Засталіся некаторыя запісы на гэту тэму выпадковых назіральнікаў, якія траплялі на тэрыторыю славян; пэўная інфармацыя пра славянскіх багоў змяшчаецца ў «Аповесці мінулых гадоў»; ёсць запісы хрысціянскіх прапаведнікаў, якія апісвалі паганскія звычаі славян, распавядаючы пра гэта ў негатыўным святле.

Рэканструяваць славянскі язычніцкі пантэон багоў можна на аснове міфалогіі ўсходніх славян, пра якую захавалася больш інфармацыі, чым пра заходнеславянскую. «Дадзеныя ж пра паўднёваславянскую міфалогію зусім бедныя: рана патрапіўшы ў сферу ўплыву старажытных цывілізацый Міжземнамор’я і раней за іншых славян прыняўшы хрысціянства, паўднёвыя славяне практычна цалкам страцілі звесткі пра былы склад свайго пантэона» [1, с. 5].

Славянскі язычніцкі пантэон не мае вялікай колькасці багоў, і той самы бог можа выступаць пад рознымі імёнамі. Ва ўяўленні старажытных славян, як і іншых этнічных супольнасцей, дабро супрацьпастаяла злу, таму і багі падзяляліся на светлых і цёмных. Галоўным светлым богам славяне лічылі Белабога: «Белабог – у славянскай міфалогіі бажаство, якое ўтварае дуалістычную пару (добрае – злое) з Чарнабогам. З’яўляецца ўвасабленнем святла. Прыносіць поспех, шчасце і выгоды мірскія» [2, с. 31]. «У Беларусі захаваўся абмежаваны ўспамін пра Белбога ў асобе Белуна. Гэта бажаство



Репозиторий ГрГМУ